## КРУГЛЫ СТОЛ, ПРЫСВЕЧАНЫ СТАГОДДЗЮ ЛЮТАЎСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ (Мінск, 10 сакавіка 2017 г.)

## THE ROUND TABLE DISCUSSION DEDICATED TO THE CENTENARY OF THE FEBRUARY REVOLUTION (Minsk, 10 March, 2017)

У 2017 г. адзначаецца стагоддзе рэвалюцыйных падзей, якія пачаліся Лютаўскай рэвалюцыяй і дасягнулі кульмінацыі ў кастрычніку, калі ў ходзе «дзесяці дзён, што ўзрушылі ўвесь свет» адбыліся звяржэнне Часовага ўрада і захоп палітычнай улады партыяй бальшавікоў пад кіраўніцтвам Уладзіміра Леніна.

Дыскусіі пра падзеі тых гадоў не спыняюцца і сёння, але даследчыкі сыходзяцца ў адным: рэвалюцыі 1917 г. мелі вялікае гістарычнае значэнне і аказалі ўплыў на лёсы многіх народаў.

Стагоддзю Лютаўскай рэвалюцыі прысвечаны навуковы круглы стол, які адбыўся на гістарычным факультэце БДУ 10 сакавіка 2017 г.

Дадзенае мерапрыемства арганізавалі кафедра гісторыі Беларусі новага і навейшага часу і кафедра гісторыі Расіі гістарычнага факультэта БДУ. Заяўленая тэма круглага стала – «Вайна, надзеі, расчараванні: люты 1917-га ў гісторыі Беларусі і Расіі» – давала ўдзельнікам магчымасць прапанаваць шырокае кола праблем для абмеркавання: ад прычын Лютаўскай рэвалюцыі, яе заваёў і страт да адлюстравання адпаведных падзей у гістарычных крыніцах, помніках, творах культуры і мастацтва.

У рабоце круглага стала прынялі ўдзел выкладчыкі, аспіранты, магістранты і студэнты гістарычнага факультэта БДУ.

Адкрыў пасяджэнне дэкан гістарычнага факультэта БДУ, доктар гістарычных навук, прафесар Аляксандр Генадзьевіч Каханоўскі, які падкрэсліў важнасць правядзення падобных навуковых мерапрыемстваў, адзначыўшы, што яны дазваляюць аператыўна адгукнуцца на гістарычныя падзеі, абмеркаваць найбольш значныя пытанні, дэталізаваць і падагульніць творчыя напрацоўкі.

У прывітальным слове загадчык кафедры гісторыі Расіі, кандыдат гістарычных навук, прафесар Алег Антонавіч Яноўскі звярнуў увагу на тое, што правядзенне круглага стала дае магчымасць усебакова разгледзець падзеі Лютаўскай рэвалюцыі і з’яўляецца вельмі эфектыўнай у навуковым сэнсе формай працы калег-аднадумцаў.

Доктар гістарычных навук прафесар Вячаслаў Іванавіч Мянькоўскі ў сваім паведамленні адзначыў праблемы, якія ўзнікаюць пры вывучэнні Лютаўскай рэвалюцыі, а менавіта: выяўленне суадносін паміж падзеямі лютага і кастрычніка 1917 г. і наяўнасці «беларускага» складніка ў іх; немагчымасць спрошчанай трактоўкі рэвалюцыйных падзей, звядзення іх да нейкага аднаго тэрміна; неабходнасць глыбокага аналізу працэсаў, што папярэднічалі лютаму 1917 г.

У паведамленні доктара гістарычных навук прафесара Аляксандра Аляксандравіча Гужалоўскага была дадзена ацэнка ролі грамадзянскай супольнасці, якая пачала фарміравацца ў выніку Лютаўскай рэвалюцыі. Першыя заканадаўчыя ініцыятывы, прынятыя Часовым урадам у Петраградзе, прыйшліся па душы ўсім без выключэння нацыянальным і канфесійным групам, якія пражывалі ў той час на Беларусі. Былі адменены палітычная паліцыя ў выглядзе жандармерыі і палітычная цэнзура – Галоўнае ўпраўленне па справах друку; улады дазволілі праводзіць публічныя акцыі, мітынгі,

сходы. Прайшла амністыя ўсіх палітвязняў, адмянялася смяротнае пакаранне, дэкларавалася роўнасць правоў жанчын і мужчын і г. д. На думку дакладчыка, паслярэвалюцыйны час стаў перыядам «сапраўднага шчасця» ў Беларусі, калі яшчэ не было складаных эканамічных умоў, жорсткага дэфіцыту харчовых і прамысловых тавараў.

Прафесар Аляксандр Генадзьевіч Каханоўскі адзначыў, што на рубяжы XIX–XX стст. у краіне былі дасягнуты значныя поспехі ў эканамічным развіцці. Гэта выяўлялася ў росце прадпрымальніцтва і капіталаў, удасканаленні вытворчасці, яе тэхналагічным пераўзбраенні, павелічэнні колькасці наёмнай рабочай сілы ва ўсіх сферах народнай гаспадаркі. Таму, на думку выступоўцы, сёння пры разглядзе прычын рэвалюцыі неабходна глыбока аналізаваць падзеі, якія папярэднічалі лютаму 1917 г., асабліва ў даваенны перыяд, калі палітычны рэжым Расійскай імперыі падаваўся вельмі ўстойлівым.

Прадметам навуковага аналізу доктара гістарычных навук прафесара Андрэя Міхайлавіча Лукашэвіча стала дзейнасць Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў у сакавіку 1917 – лютым 1918 г. Мінскі Савет рабочых дэпутатаў быў створаны 4 сакавіка 1917 г., а 6 сакавіка, калі ў часцях Мінскага гарнізона закончыліся выбары салдацкіх дэпутатаў, з'явіўся адзіны Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў, які ўжо праз два дні на сваім першым пасяджэнні абраў пастаянны выканкам. Даследчык падкрэсліў: у першыя месяцы пасля Лютаўскай рэвалюцыі Мінскі Савет рабочых і сялянскіх дэпутатаў не прэтэндаваў на ўладныя паўнамоцтвы і важную ролю ў гарадскім самакіраванні, а выступаў у якасці грамадска-палітычнай структуры, закліканай арганізаваць рабочых і салдат на падтрымку новага дзяржаўнага ладу і супрацьстаяць магчымым вылазкам прыхільнікаў звергнутай манархіі.

Кандыдат гістарычных навук дацэнт Аляксандр Вячаслававіч Бурачонак падчас свайго выступлення адзначыў адметныя рысы развіцця прамысловага прадпрымальніцтва на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі напярэдадні і пасля Лютаўскай рэвалюцыі. Навуковец падкрэсліў, што пачатак Першай сусветнай вайны, эвакуацыя прамысловых аб'ектаў і акупацыя заходнебеларускіх зямель істотна змянілі становішча ў прамысловай сферы гэтага рэгіёна, якая ў пачатку XX ст. развівалася дастаткова дынамічна. Было адзначана, што шматлікія прадпрымальнікі і працоўныя звязвалі свае надзеі на лепшае жыццё з Лютаўскай рэвалюцыяй, якая, аднак, не толькі не палепшыла стан спраў у гэтай галіне, але і наблізіла ўваходжанне прамысловасці неакупіраванай часткі Беларусі ў паласу зацяжнога крызісу.

Частка выступленняў была прысвечана разгляду Лютаўскай рэвалюцыі праз прызму мемуарнай літаратуры.

Кандыдат гістарычных навук дацэнт Святлана Леанідаўна Лугаўцова распавяла пра адлюстраванне падзей вясны 1917 г. у дзённіку Язэпа Драздовіча, падкрэсліўшы, што мемуарная літаратура не толькі раскрывае цэлую эпоху ў гісторыі, поўную драматычных падзей і працэсаў, якія змянілі краіну, але і перадае індывідуальны свет каштоўнасцей, маральных норм і эмоцый асобнага індывіда. Зварот да падзей вясны 1917 г. праз перажыванне іх Язэпам Драздовічам дазваляе па-іншаму паглядзець на гісторыю Лютаўскай рэвалюцыі.

Кандыдат гістарычных навук дацэнт кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Віталь Сяргеевіч Макарэвіч выступіў з паведамленнем пра ўспаміны В. Солскага. Адзначыўшы важнасць мемуарыстыкі як крыніцы па гісторыі Беларусі, дакладчык спыніўся на асаблівасцях грамадска-палітычных працэсаў у Беларусі пасля Лютаўскай рэвалюцыі. Ён спаслаўся на меркаванне В. Солскага, згодна з якім бальшавікі ў Мінску, у адрозненне ад бальшавікоў Пецярбурга, схіляліся да супрацоўніцтва з іншымі сацыялістычнымі партыямі.

У дакладзе кандыдата гістарычных навук дацэнта Юрыя Андрэевіча Блашкова ўвага была засяроджана на апісанні лютага 1917 г. у рамане А. Салжаніцына «Чырвонае кола». Пісьменнік, як паведаміў дакладчык, бачыў прычыны Лютаўскай рэвалюцыі ў агульнай маральнай сапсаванасці грамадства і прыйшоў да высновы пра тое, што існавалі два шляхі прадухілення рэвалюцыі – жорсткае яе падаўленне і рэфармаванне ўсяго састарэлага, неадпаведнага новым умовам. Аднак дзяржаўная ўлада была няздольная ні на першы, ні на другі варыянт, абраўшы шлях «і не ціснуць, і не дазваляць».

Асаблівасцям паўсядзённага жыцця насельніцтва ва ўмовах рэвалюцыйных зрухаў 1917 г. прысвяціла даклад кандыдат гістарычных навук дацэнт Вольга Васільеўна Брыгадзіна. Яна падкрэсліла, што гісторыя штодзённасці дапамагае даследчыку паглядзець на падзеі вачыма людзей канкрэтнага гістарычнага часу. На працягу апошняга дзесяцігоддзя расце цікавасць да жыцця грамадства Расійскай імперыі ва ўмовах дзвюх рэвалюцый 1917 г., калі былі перарваны звыклы рытм жыцця, скасоўваліся ўсе ранейшыя арганізацыі і ўстановы, грамадзянскія чыны, званні і тытулы. Рэвалюцыйныя змены адбіваліся на сацыяльнай структуры насельніцтва. Гэтыя пытанні найменш вывучаныя і надзвычай спрашчаюцца, зводзяцца альбо да суадносін колькасці гарадскіх і сельскіх жыхароў, альбо да элементарных класавых схем. Відавочна, што толькі прафесійны навуковы аналіз працэсаў на «малекулярным узроўні асобы» дае магчымасць выявіць агульныя заканамернасці рэвалюцый 1917 г.

У выступленні кандыдата гістарычных навук дацэнта Івана Афанасьевіча Літвіноўскага былі



*Злева направа:* В. І. Мянькоўскі (прафесар кафедры гісторыі Расіі, БДУ), М. Шмігель (дацэнт факультэта мастацтваў Універсітэта Мацея Бела), А. Г. Каханоўскі (дэкан гістарычнага факультэта БДУ), І. Л. Жарабцоў (дырэктар Інстытута мовы, літаратуры і гісторыі Комі навуковага цэнтра УрА РАН)

*From left to right:* V. I. Menkouski (professor at the department of the Russian history, the BSU), M. Šmigeľ (associate professor of the faculty of arts, Matej Bel University), A. G. Kohanovsky (dean of the faculty of history, the BSU), I. L. Zherebtsov (director of the Institute of Language, Literature and History, Komi Science Centre, Ural Branch, the RAS)

адзначаны праблемы, якія ўзнікаюць пры вывучэнні расійскай мадэрнізацыі ў пачатку XX ст., калі з адсталай аграрнай краіны Расійская імперыя ператварылася ў аграрна-індустрыяльную дзяржаву, напярэдадні Лютаўскай рэвалюцыі па аб'ёме прамысловай прадукцыі ўвайшла ў пяцёрку найбуйнейшых дзяржаў (разам з Англіяй, Францыяй, ЗША і Германіяй) і ўсё глыбей уцягвалася ў сусветную сістэму гаспадаркі.

Тэма паведамлення кандыдата гістарычных навук дацэнта Андрэя Мікалаевіча Максімчыка – «Рэвалюцыйная дзейнасць першага прарэктара БДУ С. З. Кацэнбогена». Дакладчык коратка спыніўся на даўніверсітэцкім этапе біяграфіі навукоўца. Згодна з дакументамі менавіта з гэтага часу Саламон Захаравіч актыўна ўключыўся ў палітычную дзейнасць. Ён адзін з трох чалавек, якія арганізавалі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў у Бабруйску, таму можна казаць, што люты 1917 г. стаў лёсавызначальным «трамплінам» у далейшай кар'еры С. З. Кацэнбогена.

Прафесар Алег Антонавіч Яноўскі ў сваім дакладзе падкрэсліў, што інтэлектуальная эліта Беларусі, навукоўцы і выкладчыкі БДУ, прайшлі праз падзеі лютага 1917 г., а Лютаўская рэвалюцыя шмат у чым вызначыла іх палітычнае мысленне.

Госці навуковага форума з Расіі і Славакіі прадставілі даклады «Рэвалюцыя 1917 г. на Расійскай Поўначы» (доктар гістарычных навук прафесар Ігар Любаміравіч Жарабцоў) і «Чэшская і славацкая гістарыяграфія расійскай рэвалюцыі 1917 г.» (кандыдат навук (гісторыя) дацэнт Міхал Шмігель).

З цікавымі паведамленнямі выступілі студэнты гістарычнага факультэта БДУ Я. А. Бодрыкаў і І. К. Пятровіч, якія разгледзелі розныя аспекты дзейнасці канстытуцыйных дэмакратаў на тэрыторыі Беларусі з лютага да кастрычніка 1917 г. і стаўленне да Лютаўскай рэвалюцыі войскаў Заходняга фронту.

Кожнае выступленне выклікала зацікаўленасць удзельнікаў круглага стала, што садзейнічала актыўнаму абмеркаванню выказаных фактаў і высноў. Падводзячы вынікі пасяджэння, прафесар А. Г. Каханоўскі зрабіў заяву аб тым, што гістарычны факультэт намераны і ў далейшым рэгулярна праводзіць абмеркаванні, прысвечаныя найважнейшым падзеям айчыннай і сусветнай гісторыі.

Па выніках праведзенага навуковага круглага стала «Вайна, надзеі, расчараванні: люты 1917-га ў гісторыі Беларусі і Расіі» плануецца выданне электроннага зборніка дакладаў і паведамленняў яго ўдзельнікаў.

У рамках візіту М. Шмігеля і І. Л. Жарабцова на гістарычны факультэт БДУ адбылося абмеркаванне перспектыў творчых кантактаў паміж навукоўцамі Беларусі, Славакіі і Рэспублікі Комі. Дэкан гістарычнага факультэта БДУ А. Г. Каханоўскі адзначыў важнасць умацавання творчых сувязей паміж універсітэтамі. Непасрэдным вынікам абмеркавання можна лічыць дасягнутую падчас сустрэчы дамову аб супрацоўніцтве паміж гістарычным факультэтам БДУ і кафедрай гісторыі філасофскага факультэта Універсітэта Мацея Бэла ў Банска-Бістрыцы, а таксама паміж гістарычным факультэтам БДУ і Інстытутам мовы, літаратуры і гісторыі Комі навуковага цэнтра Уральскага аддзялення Расійскай акадэміі навук.

***А. Ф. Паддубская,***
кандыдат гістарычных навук, дацэнт